РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А́РКА ТРЫУМФА́ЛЬНАЯ**, брама трыумфальная, пастаяннае або часовае манументальнае збудаванне ў гонар ваен. перамогі, значнай гіст. падзеі або асобы ў выглядзе ўрачыстага афармлення праезду. Мае 1 або 3 арачныя пралёты. Узнікла ў Стараж. Рыме (арка Ціта, 79—81). Форма А.т., магчыма, запазычана ад гар. брамы этрускаў. Атрымала пашырэнне ў архітэктуры ампіру ў Францыі (А.т. на пл. Зоркі ў Парыжы, архіт. Ж.Ф.Шальгрэн, 1806—36), Расіі (Трыумфальная брама ў Маскве, архіт. В.Бавэ, 1827—34; Маскоўская трыумфальная брама ў Санкт-Пецярбургу, архіт. В.Стасаў, 1834—38). У Беларусі ў 18 — пач. 19 ст. вядома пра існаванне часовых трыумфальных брам у Нясвіжы, Магілёве, Шклове. *Ю.Ю.Захарына.*